# Поступления художественной литературы для старшего и младшего школьного возраста за январь 2023 года

**Паэтычныя творы для дадатковага чытання ў XI класе: для дзяцей ст. шк. узросту / склад. С.І. Моўчан. – Мінск: Беларусь, 2022. – 383 с. – (Школьная бібліятэка).**




У кнігу ўвайшлі творы сучасных беларускіх паэтаў, лірыка якіх насычана жывапіснымі, нібы з мастацкіх палотнаў пейзажамі, прыгажосцю адносін закаханых, мудрымі філасофскімі роздумамі, пафасам непарыўнай сувязі чалавека з гісторыяй і лёсам сваёй краіны, яскравымі вобразамі і сюжэтамі, адметная сакавітай мовай.

Зборнік выдаецца ў межах праграмы, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, і прызначаны для адукацыйных мэт.

**Празаічныя творы для вывучэння беларускай літаратуры ў XI класе: апавяданні, навэлы, эсэ: для дзяцей ст. шк. узросту / уклад. Н. Крыцкая. – Мінск: Звязда, 2022. – 232 с. – (Школьная бібліятэка)**




У зборнік увайшлі творы выбітных пісьменнікаў: Івана Навуменкі, Міхася Стральцова, Георгія Марчука і Алеся Марціновіча, - якія прадстаўляюць класічную беларускую прозу 60-х гадоў XX – пачатку XXI стагоддзя.

Выданне адрасавана як вучням старэйшых класаў, так і ўсім аматарам беларускай літаратуры.

**Радзікевіч, А. Скарбы Нясвіжскага замка / А. Радзікевіч; рэд. Л.В. Саламаха; маст. К.Ю. Сарока. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2021. – 56 с.: іл. - (Бібліятэка часопіса “Вясёлка”).**




Кніга для дзецей малодшага школьнага ўзросту пра замак Радзівілаў у Нясвіжы. Прачытаўшы яе, вам захочацца пабываць у незвычайным гістарычным, рэліквійным музеі. А значыць, вы адкрыеце для сябе нешта новае пра сваю Айчыну, вы яшчэ мацней палюбіце яе.